З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Галоўнае, каб мы дамовіліся пра супрацоўніцтва, і многае можам зрабіць»

## Прэзідэнт Беларусі правёў перагаворы з губернатарам Прыморскага краю

**Сустрэча губернатара Прыморскага краю Алега Кажамякі з Аляксандрам Лукашэнкам — своеасаблівы разьвітальны акорд беларускай камандзіроўкі, якая пачалася 19 верасня. За некалькі дзён далёкаўсходнія госці наведалі машынабудаўнічыя і харчовыя прадпрыемствы Магілёўшчыны, правялі перагаворы з кіраўніцтвам Саўміна, Міністэрствам сельскай гаспадаркі Беларусі і завіталі на флагманы сталічнай цяжкай прамысловасці — МТЗ, «Амкадор», «Белкамунмаш».**

Гэта першы візіт у нашу краіну кіраўніка Прымор'я за некалькі гадоў, але далёка не першы для Алега Кажамякі. Нашчадак беларускіх перасяленцаў развіваў рэгіянальныя сувязі Беларусі і Расіі на пасадзе губернатара Амурскай, Сахалінскай абласцей, за што летась атрымаў з рук Аляксандра Лукашэнкі ордэн Пашаны.

Прэзідэнт назваў кіраўніка Прымор'я «заўсёды жаданым госцем у Беларусі», дадаўшы, што дзе б Алег Кажамякі ні працаваў, Беларусь будзе рабіць усё, што неабходна для супрацоўніцтва.

Па словах Прэзідэнта, «Магілёўшчына супрацоўнічае напрамую з далёкаўсходнім краем. Нічога, калі Магілёўшчына ад гэтага атрымае нейкі прырост — гэта будзе на карысць усёй дзяржаве», — дадаў кіраўнік краіны.

Ён падкрэсліў, што, незалежна ад геаграфіі, беларусы не разглядаюць Уладзівасток як чужы горад: «Мы часта ўспамінаем пра сваю Айчыну ад Брэста да Уладзівастока. Так што вы жывяце ў нашай Айчыне, і мы заўсёды будзем развіваць супрацоўніцтва ў гэтым плане».

Аляксандр Лукашэнка прапанаваў дапамогу ў будаўніцтве касмадрома «Усходні». «Мы вельмі ўважліва зараз падыдзем яшчэ раз да гэтага аб'екта. І прэзідэнт Расіі мяне прасіў паглядзець. Мне хацелася б паўдзельнічаць у будаўніцтве гэтага касмадрома, паказаць нашы магчымасці і на што здольныя беларускія будаўнікі. Я гатовы перакінуць туды трэст ці два. ***Галоўнае, каб мы дамовіліся пра супрацоўніцтва, і многае мы можам зрабіць на гэтым касмадроме.*** Пры тым, па цэнах і якасці нас там наўрад ці нават японцы або карэйцы перасягнуць», — сказаў Прэзідэнт.

**Тавараабарот Беларусі і Прыморскага краю са студзеня па ліпень склаў сёлета 9,1 мільёна долараў. Ён павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам 2019 года амаль на 18 працэнтаў. Сальда станоўчае ў 7,5 мільёна. Аснова экспарту — грузавыя аўто, «малочка». У рэгіёне адсутнічаюць прамыя тавара-праводныя сеткі беларускіх прадпрыемстваў. Пастаўкі тавараў народнага спажывання рэалізуюцца прамымі дагаворамі куплі-продажу, праз аптовыя структуры-пасрэднікі, дзейнічае дылерская сетка па рэалізацыі прадукцыі машынабудавання.**

Па словах кіраўніка Беларусі, прэзідэнт Расіі на сустрэчах вельмі шмат увагі надае Прыморскаму краю і настойвае, каб Аляксандр Лукашэнка пабываў у тых мясцінах. Сваё падарожжа па Далёкім Усходзе Прэзідэнт нашай краіны мяркуе пачаць з касмадрома, калі там будуць працаваць беларускія рабочыя.

Беларусы гатовы ўдзельнічаць не толькі ў пастаўках тэхнікі, але і ў яе гарантыйным і сэрвісным абслугоўванні. ***«Мы гатовыя тут і па фінансаванні выгадныя ўмовы прапанаваць, як мы гэта звычайна робім.*** Электрычныя аўтобусы, МАЗы, трамваі, тралейбусы — вельмі вялікі ў нас у гэтым вопыт. І на газаматорным паліве мы можам прапанаваць аўтобусы», — запэўніў кіраўнік краіны.

Далёкаму Усходу вядомыя магчымасці Беларусі ў сельскай гаспадарцы, бо з гэтага некалі і пачалося супрацоўніцтва. Выказваў інтарэс да гэтага і прэзідэнт Расіі Пуцін.

«Я яму кажу: вы ў Кітаі купляеце прадукты харчавання. Неабходна свае ствараць, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.— Мы гатовыя ў гэтым кірунку працаваць і ў сельскай гаспадарцы, і па насенні, і агародніцтве, і пладаводстве».

Прапанаваў Прэзідэнт і айчынны пасадачны матэрыял для садоў, каб пакаваць іншым краінам, «што самі ўсё можам». Гатовы беларусы пастаўляць у Прымор'е і сваю мяса-малочную прадукцыю, дзіцячае харчаванне, як гэта робіць Кітай.

«У мяне няма неабходнасці вас у нечым запэўніваць. Мы з вамі даўнія сябры. Лічыце, што мы сябры назаўсёды і гэта справа гонару, што мы будзем працаваць у Прымор'і і супрацоўнічаць з вамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да губернатара Прымор'я.

**Марыя ДАДАЛКА.**

### • Каментарый у тэму

**Алег Кажамяка паведаміў, што дэлегацыя з Далёкага Усходу прыбудзе на выстаўку «Белагра» (пройдзе з 29 верасня да 4 кастрычніка).**

У размове з журналістамі губернатар заявіў, што неабходна пашыраць знаёмства на ўзроўні кіраўнікоў прадпрыемстваў, развіваць прадстаўніцтва Беларусі ў краі. «Мы абазначылі канкрэтныя праграмы, звязаныя з пастаўкай беларускіх сельгаставараў для жыхароў Прымор'я, таго, што мы не выпускаем, — сыры, масла, мяса. Гэта важна для школьнага харчавання, каб дзеці елі якасныя прадукты. Таму ў «Белагра» будуць прымаць удзел нашы гандлёвыя сеткі, тыя, хто забяспечвае дзіцячым харчаваннем нашы школы, дзіцячыя сады», — дадаў Алег Кажамяка.

Закупяць для Прымор'я і нашы электробусы, а беларускія будаўнікі, магчыма, будуць працаваць у гэтым расійскім рэгіёне над сацыяльнымі аб'ектамі.

«Мы дамовіліся, што ў лістападзе прадстаўнікі вытворцаў з Беларусі на чале з Леанідам Зайцам, губернатарам Магілёўскай вобласці (вызначаны кіраўніком групы па рабоце з Прымор'ем) выедуць, каб на месцы распрацаваць дарожную карту і далей рабіць крокі па павелічэнні гандлёва-эканамічных сувязяў», — паведаміў Алег Кажамяка.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Бамбардзіроўшчыкі ЗША правялі шырокамаштабную глабальную аперацыю



Амерыканскія стратэгічныя бамбардзіроўшчыкі, якія вылецелі з авіябаз у Еўропе і ЗША ва ўзаемадзеянні са знішчальнікамі краін — членаў НАТА, здзейснілі масавыя палёты ва Усходняй Еўропе і ў заходняй частцы Ціхага акіяна. Аб гэтым паведаміла Еўрапейскае камандаванне Узброеных сіл ЗША. Паводле дадзеных заходніх маніторынгавых сайтаў, у прыватнасці, быў зафіксаваны палёт стратэгічнага бамбардзіроўшчыка B-52H, здольнага несці ядзерную зброю, паблізу Ленінградскай вобласці ў раёне Фінскага заліва і Эстоніі. У аперацыях прынялі ўдзел ВПС Канады, Нарвегіі і Вялікабрытаніі.

## Італьянцы на рэферэндуме выказаліся за скарачэнне месцаў у парламенце



Аб гэтым паведаміла выданне il Fatto Quotidiano. За такую рэформу выказалася каля 70 працэнтаў тых, хто прагаласаваў. Такім чынам, з наступных выбараў у палаце дэпутатаў будзе 400 чалавек замест цяперашніх 630. У сенаце застанецца 200 месцаў (цяпер іх — 315). Пытанне аб скарачэнні месцаў у парламенце даволі даўно абмяркоўваецца ў Італіі. Мяркуецца, што такія меры дазволяць дзяржаве сэканоміць грошы і забяспечыць больш эфектыўнае кіраванне краінай.

## Deutsche Bank паведаміў аб падазроных здзелках на трыльён еўра




Рэзананасная публікацыя Міжнародным кансорцыумам журналістаў (ICIJ) дадзеных аб падазроных банкаўскіх аперацыях з сакрэтнага дасье Упраўлення ЗША па супрацьдзеянні фінансавым злачынствам (FinCEN) не абыйшла бокам Deutsche Bank, паведамілі нямецкія СМІ. Банкі, якія вялі бізнес у ЗША з 2000-га па 2017-ты, паведамілі FinCEN аб падазроных здзелках на агульную суму ў $2 трлн (1,68 трлн еўра). Амаль дзве трэціны гэтай сумы (1,09 трлн еўра) прыйшліся на аперацыі ў Deutsche Bank, паведаміла Deutsche Welle. Глабальная інфраструктура гэтага банка выкарыстоўвалася для адмывання грошай на працягу больш доўгага перыяду і ў больш шырокіх маштабах, чым лічылася раней, паведамляюць Sьddeutsche Zeitung і медыякампаніі NDR і WDR. Акрамя таго, сістэмы бяспекі Deutsche Bank не выконвалі свае функцыі, сцвярджаюць следчыя.

Меркаванне

**Ігар БУЗОЎСКІ:**

# «Трэба берагчы самае дарагое, што мы маем»

**Клапаціцца пра дзяцей і абараняць іх ад усякага роду пагроз, здавалася б, натуральны закон прыроды, важнасць якога нікому не трэба тлумачыць. Але, як паказвае практыка, часам жыццё ўносіць свае карэктывы і сістэма дае збой... І тады ўжо спрабуеш зразумець, хто можа абараніць правы дзіцяці, і адказнасць бацькоў ці дзяржавы тут большая. Па адказы на некаторыя пытанні, што непакояць сёння грамадскасць, «Звязда» звярнулася да члена Нацыянальнай камісіі па правах дзяцей Ігара Бузоўскага.**

***— Ігар Іванавіч, акрэсліце, якія зараз найбольш вострыя праблемы ёсць у нашай краіне, што датычаць тэмы парушэння правоў дзяцей?***

— У цэнтры ўвагі тых, хто на ўзроўні дзяржавы і ў колах неабыякавых грамадзян непакоіцца і займаецца праблемамі дзяцінства, падтрымкі і выхавання дзяцей, сёння паранейшаму вострa гучаць шматлікія тэмы, актуальныя не толькі для большасці краін свету. Мы жывём у глабальным свеце і знаходзімся ў вялікай геапалітычнай прасторы, якая наўпрост ці ўскосна закранае такога роду праблемамі і наша грамадства. Таму тэмы гвалту ў сям'і, распаўсюджванне наркотыкаў, сацыяльна небяспечныя ўмовы — з'яўляюцца актуальнымі і для нас. Наша Нацыянальная камісія па правах дзяцей працуе над тым, каб абараніць дзяцей ад усіх згубных рэчаў такога характару.

***— Скажыце, у святле абвостранага палітычнага супрацьстаяння, якое мы назіраем апошнія месяцы ў Беларусі, як абараніць дзяцей ад уцягвання ў гэтыя падзеі?***

— Калі канкрэтна па згаданай сітуацыі, то так, у нас зараз актыўна праходзяць працэсы грамадска-палітычныя, звязаныя з выбарчай кампаніяй кіраўніка дзяржавы. І адбітак яны знаходзяць у розных плоскасцях з закрананнем эканамічных, сацыяльных, міжнародных пытанняў. Апошнім часам да нас звяртаюцца прадстаўнікі грамадскіх колаў, бацькі з абурэннямі, што бачаць па СМІ, у інтэрнэце і на вуліцы, як удзельнікі несанкцыянаваных акцый уцягваюць дзяцей, падлеткаў у сваю дзейнасць, альбо дзеці туды трапляюць з-за адсутнасці належнага кантролю з боку дарослых. І ў гэтай сітуацыі паняцце адказнасці ўжо распаўсюджваецца не толькі за сваіх дзяцей, але і за дзяцей у грамадстве ў цэлым. Бо іх інтарэсы і правы ў нашай краіне абараняюцца законам.

На жаль, мы ўжо ў сваёй краіне бачылі, якія наступствы могуць мець масавыя несанкцыянаваныя мерапрыемствы, якія потым ператвараюцца ў натоўп. І якімі наступствамі яны адгукнуліся для асобных сем'яў. То-бок, у такіх сітуацыях пытанне забеспячэння фізічнай бяспекі — першачарговае. І тут яшчэ важна памятаць пра тое, што ёсць маральная, псіхалагічная небяспека, якая ўзнікае ў атмасферы натоўпу. Дзіцячая псіхіка яшчэ нясталая для ўспрымання інфармацыі, тым больш той, дзе прысутнічаюць псіхоз і агрэсія, магчыма, некантралюемыя паводзіны людзей. Асабліва, калі яны знаходзяцца на мяжы з законам і тым больш, калі яго парушаюць.

Таму мы пры неабходнасці будзем ініцыіраваць разгляд такіх выпадкаў і прымаць неабходныя меры. Каб, як мінімум, на праваым узроўні ў тых, хто нясе адказнасць за дзіця, было ўсведамленне ўсіх рызык і наступстваў. Хочацца, каб людзі разумелі, што такія паводзіны і неабдуманыя дзеянні нельга дапускаць. Гэта забараняецца законам і тымі нарматывамі, якія абараняюць сёння нашых дзяцей.

***— У прэсе гучала інфармацыя, што такія паводзіны бацькоў будуць атрымліваць прававую ацэнку. Якія могуць быць наступствы?***

— Думаю, рашэнні будуць прымацца, зыходзячы з таго, як працягнуць складвацца абставіны. Пакуль што мы фіксуем гэтыя выпадкі, назіраючы за падзеямі, і разумеем, што тут нельга сядзець склаўшы рукі. Пэўныя рашэнні ўжо прымаюцца і работа выконваецца камісіяй. Цяпер праводзіцца шырокае інфармаванне бацькоў і грамадскасці наконт гэтых абставін. Калі спатрэбіцца, то, мабыць, трэба будзе грамадскасці (якая абараняе правы і інтарэсы дзяцей і падлеткаў на ўсіх узроўнях) і непасрэдна камісіі прымаць больш радыкальныя меры па прыцягненні да адказнасці. Бо, нават улічваючы пазіцыю некаторых «гэта маё дзіця, таму што хачу, тое і раблю», ёсць паняцце грамадства, якое сёння павінна бараніць дзяцей і іх правы. І гэта датычыцца не толькі нейкіх рэчаў, якія звязаны з выхаваннем, адукацыяй, але і са здароўем фізічным і псіхалагічным. Клапаціцца пра гэта — прамы абавязак дзяржавы. Бо тое, што адбываецца сёння, проста па-за межамі разумення бацькоў, якія занепакоены спакойным і нармальным фарміраваннем сваіх дзяцей, іх выхаваннем як асоб. Перад вачыма стаяць эпізоды, якія павінны былі б хайпануць на эмоцыях, і яны дасягнулі сваёй мэты, дзе маці трымае дзіця за руку, і тое плача, а яна перад праваахоўнікамі эмацыянальна адстойвае нейкую сваю грамадскую пазіцыю. Калі ўзнікла ў гэтым рэчышчы непаразуменне такога роду, дзе ёсць пагроза бяспецы і здароўю дзяцей, значыцца будзем звяртацца да заканадаўчай базы, каб адстойваць іх інтарэсы.

Я сам бацька і добра разумею, што нідзе акрамя сям'і дзіця не атрымае лепшага выхавання і больш увагі і цяпла, але ёсць межы, якія нельга пераходзіць. І варта перш за ўсё думаць пра сваіх дзяцей. Трэба берагчы самае дарагое, што мы маем.